# БЕЛОРУССКАЯ ИСТОРИЯ В ИСТОЧНИКАХ, НАУЧНОЙ ТРАДИЦИИ И ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКИХ ИННОВАЦИЯХ

## ФОРМА ПАЛІТЫЧНАЙ БАРАЦЬБЫ МАГНАЦКАЙ ГРУПОЎКІ САПЕГАЎ У 1696–1702 гг. Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

**Ф. Ю. Бохан**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, frantishek.bohan@gmail.com*

У артыкуле разглядаюцца падзеі Грамадзянскай вайны 1696–1702 гг. у ВКЛ, падчас якіх прыхільнікі магнацкай групоўкі Сапегаў выкарыстоўвалі ў адносінах да апанентаў нелегітымныя метады палітычнай барацьбы. На падставе аналізу канкрэтных выпадкаў кампаніі, арганізаванай прыхільнікамі групоўкі Сапегаў падчас канфлікту з групоўкай «рэспубліканцаў», аўтар раскрывае прычыны такіх дзеянняў, а таксама паказвае іх наступствы і ўплыў на далейшы ход Грамадзянскай вайны і палітычную сітуацыю ў Рэчы Паспалітай.

***Ключавыя словы:*** Вялікае Княства Літоўскае; Рэч Паспалітая; шляхта; Сапегі; магнаты; «Рэспубліканцы»; нелегітымныя метады палітычнай барацьбы.

## ФОРМА ПОЛИТИЧЕСКОЙ БОРЬБЫ МАГНАТСКОЙ ГРУППИРОВКИ САПЕГ В 1696–1702 гг. В ВЕЛИКОМ КНЯЖЕСТВЕ ЛИТОВСКОМ

**Ф. Ю. Бохан**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, frantishek.bohan@gmail.com*

В статье рассматриваются события Гражданской войны 1696–1702 гг. в ВКЛ, во время которых приверженцы магнатской группировки Сапег использовали в отношении оппонентов нелегитимные методы политической борьбы. На основе анализа конкретных случаев кампании, организованной сторонниками группировки Сапег во время конфликта с группировкой «республиканцев», автор раскрывает причины таких действий, а также показывает их влияние на дальнейший ход Гражданской войны и политическую ситуацию в Речи Посполитой.

***Ключевые слова:*** Великое Княжество Литовское; Речь Посполитая; шляхта; Сапеги; магнаты; «Республиканцы»; нелегитимные методы политической борьбы.

# THE FORM OF THE POLITICAL STRUGGLE OF THE SAPIEHA MAGNATE GROUP IN 1696–1702 IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA

**F. Yu. Bokhan**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, frantishek.bohan@gmail.com*

The article examines the events of the Civil War of 1696–1702 in the Grand Duchy of Lithuania, during which supporters of the magnate group of Sapieha used illegal methods of the political struggle against their opponents. Based on the analysis of specific cases of the campaign which was organized by the Sapieha's supporters during the conflict with the noble group of the "republicans", the author reveals the causes of these actions, and also shows its influence on the further course of the Civil War and the political situation in the Polish-Lithuanian Commonwealth.

***Keywords:*** Grand Duchy of Lithuania; Polish-Lithuanian Commonwealth; noble; Sapieha; magnate; "Republicans"; illegal methods of the political struggle.

У любым грамадстве ўзнікаюць сітуацыі, калі з-за непрыязных адносін паміж палітычнымі суб'ектамі пачынаюцца канфлікты. Часам зацятасць удзельнікаў супрацьстаяння падштурхоўвае іх да выкарыстання сілавых метадаў палітычнай барацьбы. Яго сутнасць складаецца ў застрашэнні сваіх палітыных супернікаў пагрозай прымянення, ці рэальным ужыванні ў адносінах да іх фізічнага гвалту. У любым палітычным змаганні выкарыстанне зброі лічыцца крайняй, нават амаральнай мерай. Аднак нягледзячы на негатыўнае стаўленне да такой формы палітычнага змагання з боку грамадскасці, гвалт усё роўна выкарыстоўваўся пэўнымі сіламі для дэстабілізацыі палітычнай сітуацыі і дасягнення пэўных мэтаў у кароткія тэрміны. Паказальным прыкладам выкарыстання нелегітымных метадаў змагання з'яўляюцца падзеі, якія адбываліся падчас Грамадзянскай вайны ў ВКЛ у 1696–1702 гг.

Вайна пачалася з-за працяглага канфлікту паміж родам Сапегаў і астатняй магнатэрыяй ВКЛ. На працягу апошняй чвэрці XVII ст. Сапегі, а таксама выхадцы з бліжэйшага атачэння гэтага шляхецкага рода займалі падаўляючую большасць дзяржаўных пасад ВКЛ. Прадстаўнікі рода Сапегаў практычна захапілі ўладу ў Княстве і сталі гэтым злоўжываць на сваю карысць. Напрыклад, яны вывялі харугвы з дзяржаўнага рээстра і стварылі з іх сваё прыватнае войска. У выніку Сапегі сталі своеасаблівым палітычным гегемонам ВКЛ. Сярод шляхты ўтварылася значнае кола людзей, якія іх падтрымлівалі.

Такое становішча не задавальняла многіх прадстаўнікоў іншых магнацкіх родаў, найперш Агінскіх, Пацеяў, Радзівілаў. Для супрацьстаяння

Сапегам у сярэдзіне 1690-х гг. імі была створана палітычная групоўка, вядомая як «рэспубліканцы». Першапачаткова выключна магнацкі, рух імкліва павялічваўся закошт шляхты, пацярпелай не толькі ад саміх Сапегаў, але і ад іх прыхільнікаў.

Рэспубліканцы адразу сталі ўплывовай палітычнай сілай, якая аказвала вялікі ціск на апанентаў. Ужо ў 1697 г. кіруючыя паўнамоцтвы Сапегаў былі абмежаваныя з-за зменаў заканадаўства, ініцыяваных рэспубліканцамі. Згодна з зацверджаным «Актам аб каэквацыі», шляхта ВКЛ ураўноўвалася ў правах з польскай. Дзякуючы гэтаму, паўнамоцтвы пэўных органаў улады, якімі ў той час кіравалі прыхільнікі Сапегаў, перайшлі да сойма, дзе значную частку складала дробная шляхта. Акрамя таго, акт дазваляў прыцягвацьураднікаў да судовай адказнасці ў Галоўным Трыбунале ВКЛ [1, с. 184].

Сапегі ўсведамлялі пагрозу для сябе з боку гэтага акта, таму падчас абмеркавання закона ўсяляк імкнуліся змяніць яго змест ці сарваць яго прыняцце. Так, іх прыхільнікі прапаноўвалі дазволіцьураднікам весці судовыя справы без разгляду Галоўнага Трыбунала, што ўскосна рабіла б Сапегаў недатыкальнымі асобамі, паколькі яны захоўвалі выканаўчую ўладу. Прапанова была няўдалай і яшчэ больш абвастрыла канфлікт. Тады шляхта з ваяводстваў, дзе была вялікая падтрымка групоўкі Сапегаў (Навагрудскае, Берасцейскае), проста адмовілася падпісваць «Акт аб каэквацыі» на пасяджэнні сойма. Тым не менш, большасць дэпутатаў стала на бок рэспубліканцаў і дакумент уступіў у сілу без подпісаў паслоў з асобных ваяводстваў.

Пасля змены заканадаўства, рэспубліканцы скіравалі свае сілы на падрыхтоўку да наступнай кадэнцыі Галоўнага Трыбунала. На ёй меркавалася правесці серыю судовых разбіральніцтваў супраць Сапегаў і такім чынам канчаткова пазбавіць іх улады. Выбары ў Трыбунал 1698 г. скончыліся поўнай паразай групоўкі Сапегаў якія амаль не атрымалі пасадаў суддзяў. А яе нешматлікія прадстаўнікі, якіх абралі, былі не дапушчаны да пасяджэнняў.

Сапегі ажыццявілі спробу разгону нелаяльнага Трыбунала сілай. Незадоўга да пачатку кадэнцыі вялікі канюшы Міхал Францішак Сапега спрабаваў зрабіць збор войска ВКЛ у Гародні. Але да гэтага часу прыхільнікі рэспубліканцаў, якіх было колькасна болей, згуртавалі ўласнае войска на чале з Рыгорам Агінскім. Таму калі вайсковае кола ў Гародні было адбылося, то большасць жаўнераў выступіла супраць Сапегаў [6, арк. 1602–1603].

Нягледзячы на няўдачу, Сапегі і іх прыхільнікі вырашылі змагацца з Трыбуналам уласнымі сіламі. Аднак на сваім шляху яны сустрэлі войска Агінскага і пасля невялікай сутычкі былі вымушаны сыйсці.

Тым часам кадэнцыя Трыбунала пачалася. З яе першых дзён сталі разглядацца справы аб злоўжыванні службовым становішчам Сапегамі і іх прыхільнікамі. На іх падалі скаргі аб карупцыі, прысваенні дзяржаўнай маёмасці, прыўлашчванні чужых уладанняў, зрыванні кадэнцый вальных соймаў, узброеным ціску на паслоў, спусташэнні дзяржаўнай і царкоўнай маёмасці, невыкананні каэквацыі і іншых злачынствах. У выніку, суд пастанавіў пазбавіць Сапегаў дзяржаўных пасадаў і не дапускаць прадстаўнікоў гэтага рода ва ўрад у будучыні. Пасля гэтага суд узяў перапынак і частка ўдзельнікаў раз'ехалася па сваіх дамах [8, s. 319].

Гэтым момантам скарысталіся прыхільнікі Сапегаў, якія арганізавалі атакі на канвоі з аховай суддзяў Галоўнага трыбунала. Такія сутычкі выліваліся ў маштабныя бітвы, найбольш адметнай з якой стала бітва пры Жыжморах.

29 красавіка, Міхал Сапега са сваім войскам рабіў аб'езд ваколіц горада і выпадкова наткнуўся на канвой рэспубліканцаў, якія ахоўвалі мясцовых дэпутатаў трыбунала. Ахова ўяўляла сабой невялікую групу жаўнераў на чале з Рыгорам Агінскім. Пабачыўшы сілы праціўніка, Агінскі адступіў у суседнюю вёску Жыжморы і пачаў рыхтавацца да абароны. Але ноччу, у лагеры адбылося паўстанне, узначаленае падкупленым Сапегам жаўнерам. Ён застрашыў саслужыўцаў тым, што лагер хутка пачнуць атакаваць і вораг знішчыць усё войска, калі яму не выдадуць у палон вышэйшае афіцэрства. Ваяры паддаліся правакацыю і пачалі бунт. Аднак з-за таго, што ў атрадзе Агінскага прысутнічалі замежныя найміты, вестка аб бунце дайшла да камандзіраў і яны ўцяклі. Тады прыхільнікі Сапегаў сталі браць у палон усіх людзей, якія не паспелі збегчы з лагеру.

Так, у палон трапіў кіраўнік вайсковай канцылярыі Караль Белазор. Ён быў падначаленым Рыгора Агінскага і пісарам Галоўнага трыбунала, за чыім подпісам сталі выракі на судовыя справы супраць Сапегаў, дзе апошнім прысудзілі цяжкія пакаранні. Раз'юшаныя ўцёкам Агінскага, Сапегі вырашылі яго застрашыць. Са згоды вялікага гетмана Казімра Сапегі над пісарам правялі ваенны суд і 12 мая публічна расстралялі ў Коўне [7, s. 105].

Акрамя забойстваў паплечнікаў Р. Агінскага існавалі і іншыя прыклады замахаў на жыццё палітычных праціўнікаў Сапегаў. 15 мая 1698 г. ахвярамі нападу наймітаў сталі Лявон Агінскі і Людвік Пацей, якія мелі спрэчкі з Сапегамі за маёмасць. Напад удалося адбіць, але Агінскага цяжка паранілі [4, арк. 558]. Адначасова з замахамі на жыццё палітычных апанентаў, Сапегі пачалі рабіць масавыя набегі на маёнткі і фальваркі шляхты, якая прымала ўдзел у Трыбунале. Дзясяткі ўладанняў былі пашкоджаны, абрабаваны ці цалкам знішчаны. З мая 1698 г. у Трыбунал ВКЛ сталі актыўна прыходзіць скаргі шляхты з розных частак ВКЛ аб шкодзе маёмасці.

Вельмі шмат сведчанняў аб гвалце з боку прыхільнікаў Сапегаў прыйшло з Ковеншчыны і Берайсцейшчыны, дзе былі выпалены маёнткі мясцовых рэспубліканцаў [5, арк. 550–551]. Да таго ж, акрамя шляхты на Сапегаў скардзіліся і прадстаўнікі касцёла. Падчас рэйдаў на варожыя ўладанні, салдаты групоўкі Сапегаў займалася рабаўніцтвам касцёлаў і іншай маёмасці царквы, якая падтрымала рэспубліканцаў. Гэтую інфармацыю асабіста пацвярджалі пацярпелыя шляхцічы і прадстаўнікі царквы.

Дзеянні Сапегаў выклікалі хвалю абурэння з боку шляхты. На наступным пасяджэнні трыбунала была заведзена крымінальная справа супраць Сапегаў, звязаная з падзеямі каля в. Жыжморы. Галоўным ісцом выступіў Рыгор Агінскі, як непасрэдны ўдзельнік таго інцыдэнту. Паданая ім скарга налічвала шмат пунктаў, сярод якіх былі: забойства Караля Белазора; абрабаванне касцёла ў Жыжморах; спаленне двароў у той жа вёсцы; абрабаванне вазоў шляхты, што накіроўвалася дадому з трыбунала і інш. Адказнымі за злачынствы былі завочна абʼяўлены вялікі гетман Казімір Сапега, яго сыны Юрый і Міхал, камандзіры харугваў і ўвогуле ўсе жаўнеры Сапегаў, якія прымалі ўдзел у бітве. Падсудных прызналі «ворагамі Айчыны», ім прысудзілі інфамію і агульны штраф памерам у 2 мільёны злотых. Аднак з выракам суда на пагадзіліся семʼі забітых, таму быў праведзены новы разгляд справы, сканцэнтраваны выключна на расстрэле пісара.

8 жніўня на пасяджэнні Трыбунала ВКЛ, у прысутнасці сямейства Белазораў, вінаватымі ў забойстве прызналі Вялікага гетмана, яго сына Міхала і падначаленых ім кіраўнікоў харугваў. Пасудным прысудзілі смяротнае пакаранне, чарговую інфамію і новыя штрафы. З-за адсутнасці ў судзе фігурантаў справы, ажыццявіць пакаранне не атрымалася [2].

Справа аб замаху на жыццё Лявона Агінскага і Людвіка Пацея разглядалася ў першых чыслах кастрычніка 1698 г. Галоўным вінаватым прызналі Міхала Юзэфа Сапегу, пляменніка вялікага гетмана К. Сапегі. Разам з ім у спіс падсудных трапіў яго бацька, Бенедыкт Сапега і кіраўнікі падначаленых ім харугваў. Трыбунал вынес рашэнне аб смяротным пакаранні фігурантаў і грашовай кампенсацыі Л. Агінскаму за нанесеную шкоду.

Да ліку іншых спраў аб палітычных забойствах, арганізаваных Сапегамі, адносіцца справа пісара Багуслава Бакея, якая адбылася яшчэ ў снежні 1697 г. Як і Белазор, Бакей быў набліжаным Рыгора Агінскага. У судзе была выкладзена версія, што пісар вяртаўся пасля візіта да караля і быў схоплены прыхільнікамі Сапегаў, якія правялі незаконны суд і праз некалькі дзён яго забілі. Спіс абвінавачанных у дадзеным злачынстве быў амаль такі ж, як і ў справе Белазора. 7 красавіка 1699 г. адбыўся фінальны разгляд справы, на якім прысутнічалі родзічы забітага. Вырак суда быў ідэнтычны таму, які выдалі забойцам Белазора: смяротнае пакаранне, інфамія і штраф [4, арк. 558; 5, арк. 550–551].

Што тычыцца разгляду атак Сапегаў і іх прыхільнікаў на маёнткі палітычных апанентаў, паказальнай з'яўляецца справа Адама Янішэўскага, якую разгледжвалі 20 сакавіка 1699 г. Па сведчанням Янішэўскага, на яго ўладанні Збышын і Чычэвічы быў здзейснены рабаўніцкі налёт, а таксама прыўлашчана частка зямель маёнтка. Адказнымі за арганізацыю злачынства прызналі гетмана Казіміра Сапегу і яго блізкага паплечніка, віленскага падкаморыя Казіміра Дамброўскага. Атаку ажыццявілі арыгінальным чынам: у ёй прымалі ўдзел не вайскоўцы ці найміты, а сяляне з быхаўскіх уладанняў Сапегаў. Цікавай акалічнасцю стала тое, што ў адрозненні ад Сапегі, Дамброўскі прысутнічаў на судзе і больш таго, быў вызвалены ад пакарання. Магчыма, Дамброўскі своечасова памяняў бок супрацьстаяння.

Неабходна звярнуць увагу на тое, што арганізацыя замахаў планавалася загадзя. Сапегі рыхтаваліся да горшага развіцця падзей і таму рабілі спісы патэнцыйных ахвяраў яшчэ за некалькі месяцаў да пачатку Галоўнага Трыбунала. Так, на судзе разглядалася справа аб арганізацыі замаха на жыццё жамойцкага харунжага Казіміра Заранка-Гарбоўскага. Яшчэ ў снежні 1697 г. Сапегі з жамойцкімі прыхільнікамі падрыхтавалі забойства харунжага і падаслалі да яго забойцу, якога паспелі затрымаць і той паведаміў пра падрыхтоўку забойства. Наступнай вясной Сапегі ажыццявілі новую спробу замаха і арганізавалі засаду ў валоданнях аднаго са сваіх паплечнікаў, аднак Заранак-Гарбоўскі паспеў яе абмінуць.

Пазней, у адказ на напады прыхільнікаў Сапегаў, рэспубліканцы таксама ўчынілі гвалт. Так, 18 лістапада 1700 г. адбылася вырашальная бітва Грамадзянскай вайны каля в. Алькенікі. Армія Сапегаў пацярпела паразу, а яе частка трапіла ў палон. Сярод палонных быў і арганізатар нападаў Міхал Францішак Сапега. Ён быў забіты ад рук натоўпу раз’юшанай шляхты, сярод якіх былі родзічы ахвяраў групоўкі Сапегаў (у тым ліку брат пісара Белазора) [3, с. 55].

Дзеянні Сапегаў, скіраваныя на запужванне і фізічнае знішчэнне палітычных апанентаў, пацярпелі поўны крах. Спробы прымусіць рэспубліканцаў спыніць барацьбу пад падгрозай жыцця выклікалі яшчэ большую іх зацятасць у змаганні. Бессэнсоўная жорсткасць у дачыненні да нізавой шляхты і грамадзянскага насельніцтва пазбавіла Сапегаў падтрымкі. Падаўляючая большасць шляхты ВКЛ або далучылася да рэспубліканцаў, або не ўмешвалася ў канфлікт. За Сапегамі замацавалася рэпутацыя злачынцаў і катаў, што пазней прывяло да самасудных забойстваў прадстаўнікоў гэтай магнацкай дынастыі.

У глабальным плане гвалт з боку прыхільнікаў Сапегаў толькі наблізіў перамогу аб'яднанай магнатэрыі ВКЛ. Гэта, у сваю чаргу, выклікала скасаванне гегемоніі Сапегаў. Страта ўнутрыпалітычнай падтрымкі прымусіла Сапегаў шукаць знешнюю падтрымку, якую тыя знайшлі ў Швецыі. Пазней

гэта прывяло да шведскага ўварвання на тэрыторыю Рэчы Паспалітай і новага ўнутрыпалітычнага канфлікту паміж прыхільнікамі саюза са Швецыяй і саюза з Расіяй, які стаў чарговым штуршком да заняпаду Рэчы Паспалітай.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Віцько Д.* Праграма ўраўнавання (каэквацыі) правоў беларуска-літоўскай шляхты з правамі польскай у канцы XVII ст. // Молодежь в науке — 2007 : приложение к журналу «Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» : [материалы международной научной конференции молодых ученых, г. Минск, 23–26 октября 2007 г.] : в 4 ч. Минск, 2008. Ч. 2 : Серия гуманитарных наук. С. 181–186.

2. *Віцько Д.* Спробы рэспубліканцаў дамагчыся ўлады над войскам ВКЛ у 1697–1698 гг. // Беларускі Гістарычны Агляд. Том. 15., 2008 г. С. 305–328.

3. *Мацук А. У.* Полацкі кашталян Мікалай Шэмет у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай у першай трэці XVIII стагоддзя // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. 2016. № 9. С. 55–61.

4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). КМФ № 18. Літоўская метрыка (Архіў канцылярыі ВКЛ) з Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў у Маскве. С. 149. Метрыка ВКЛ розных прывілеяў, глейтаў, спраў паточных і крэпасных караля Аўгуста II; кніга віцэ-канцлера Караля Станіслава Радзівіла (1697–1699)

5. НГАБ. Фонд 1705. Брестский гродский суд. Воп. 1. Спр. 116. Актовая книга (1698–1699).

6. НГАБ. Фонд 1732. Ошмянский гродский суд. Воп. 1. Спр. 48. Книга поточная (1679–1699).

7. *Rachuba A.* Sapieha Michał Franciszek // Polski Słownik Biograficzny. Warszawa–Kraków, 1994. T. XXXV/1. Z. 144. S. 104– 106.

8. *Rachuba A.* Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1567–1763. Warszawa: Wydawnictwo Sejmowe, 2002. 376 s.